БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# ЦЭ ЦТ

ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫ ЭКЗАМЕН

ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ

# Зборнік тэстаў

Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Аверсэв

## ВАРЫЯНТ 1

### Частка *А*

**А1.** Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана лексічнае значэнне выдзеленых слоў:

1) ***уплываць*** на творчасць — *'рабіць уздзеянне на што-небудзь'*;
2) вельмі ***зручны*** — *'такі, якім лёгка, прыемна карыстацца'*;
3) ***апоўдні*** пацяплела — *'у сярэдзіне дня'*;
4) добры ***лук*** — *'агароднінная расліна'*;
5) ***небескарысны*** занятак — *'якія не прыносіць карысці'*.

**А2.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:

1) планета ***(В/в)енера***;
2) дрэва ***(Т/т)аполя***;
3) знаёмы ***(Г/г)амяльчанін***;
4) торт ***«(К/к)азка»***;
5) возера ***(С/с)труста***.

**А3.** Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар:

1) Таццяна ***<u>Ў</u>***ладзіміраўна;
2) выдатна адказва***<u>ў</u>***;
3) сур'ёзная падрыхто***<u>ў</u>***ка;
4) доўга сядзелі, ***<u>у</u>***спаміналі;
5) адкрыты шлагба***<u>ў</u>***м.

**А4.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) фельетон;
2) з'яднаць;
3) шчаў'е;
4) карэнчык;
5) інтэрвью.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) нафтасховішча;
2) паў-яблыка;
3) Дунін-Марцінкевіч;
4) агра-турызм;
5) карабель-спадарожнік.

**А6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:

1) ***(хутка) крылы*** стрыж;
2) ***(абсалютна) правільны*** адказ;
3) ***(Усходне) Сібірскае*** мора;
4) ***(чатырох) корпусны*** будынак;
5) ***(чырвона) аранжавы*** касцюм.

**А7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не***, ***ні*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:

1) ***(не) сказаўшы*** адраса;
2) ***(не) паседлівае*** дзіця;
3) ***(ні) што*** не перашкаджала;
4) ***(не) гарачая***, але смачная кава;
5) звесткі ***(не) пададзены***.

**А8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) спелыя калоссі;
2) тры восьмых поля;
3) дзівіцца з унучкі;
4) падвезці да школы;
5) пайсці ў чарніцы.

**А9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Кластар — графічнае адлюстраванне сувязей паміж ключавым словам і звязанымі з ім паняццямі.
2) Стакроткі, вядома, — другая назва маргарытак.
3) Андрэйка — гоп у снег.
4) Выхоўваць — адказная справа.
5) Ветлівы чалавек — мой новы калега.

**А10.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Лета пахне суніцамі, і малінамі, і чарніцамі.
2) Узносяць жаваранкі ў вясенняе неба крынічак звон або журчанне ручайкоў.
3) Ні з таго, ні з сяго ранак дарогі марозам скаваў.
4) Актавая зала ў нашай школе аздоблена дзівосным, беларускім арнаментам.
5) То на сонейку грэецца, то ў вадзе хаваецца лотаць.

**A11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):

1) Урачыста__ быццам на свята__ прыбраўся ў чабор маладзенькі бор.
2) Санкт-Пецярбург вядомы ўсяму свету__ як горад-музей пад адкрытым небам.
3) Салодкія__ што цукар__ растуць у маім садзе бэры.
4) Дарога__ як дарога, але ж вядзе яна да роднага парога.
5) Асеннімі барвамі долы гарэлі, бярозы__ нібыта сышлі з акварэлі.

**A12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:

1) Наш славуты лірык__ Максім Багдановіч пераклаў на беларускую мову творы антычных паэтаў.
2) Азёры вакол Браслава злучае з Заходняй Дзвіной Друйка__ невялікая, з павольнай плынню рэчка.
3) Бярозка__ абвешаная бліскучымі льдзінкамі__ нагадвала крыштальную люстру.
4) Каб у школу дзеткі восенню пайшлі, працавалі__ не пакладаючы рук__ будаўнікі.
5) Вырваўшыся праз расчыненае акно__ паліласа на вячэрнія кварталы музыка раяля.

**A13.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы (улічыце, што пабочныя словы знакамі прыпынку не выдзелены):

1) Добра думаецца пад ціхі асенні дождж.
2) У буслінае гняздо дарэчы ніколі не б'е маланка.
3) Шчыры чалавек шчыра радуецца нават чужому шчасцю.
4) У вольны час люблю прызна́юся падарожнічаць па родным краі.
5) Вучы́цца аднак ніколі не позна.

**A14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх прапушчаны знак прыпынку:

1) Зноў дрэвы захутаны ў шалікі зялёныя і ў полі расцелены зялёны дыван.
2) Які дзівосны вечар і які спакой у вечаровым аксаміце!
3) Прайшоў па га́і спорны дождж і зазіхацелі чысцінёй лісточкі на бярозах.
4) Свеціць сонейка залацістае і мядовы пах плыве над грэчкай, і бяжыць кудысьці вузенькая рэчка.
5) Салаўіныя трэлі і жаўранкавы звон.

**A15.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) На поўначы бераг Нарачы набывае форму чашы, якая да краёў напоўнена вадой.
2) Кажуць, што калі прызна́еш сваю памылку, напалову яе паправіш.
3) Каб забяспечыць неабходны ўпор пры руху па рыхлай зямлі старажытныя егіпцяне-земляробы прыдумалі абцасы.
4) Студні ў дзядулевым двары, вада з якой смачнейшая за квас, мне не забыць ніколі.
5) У кожнага бываюць хвіліны, калі вяртаешся ў мінулае, і калі моцна кранаюць сэрца ўспаміны.

**A16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ], [ ].**

1) Янка Купала напісаў геніяльны верш «Спадчына» Ігар Лучанок напісаў музыку ансамбль «Песняры» выканаў песню.
2) Трэба дома бываць часцей трэба дома бываць не госцем.
3) Жнівеньскае поле пахне хлебам ідзе са жнівеньскага неба ноччу зорны дождж.
4) Гляджу на буслянку і разумею недзе ў спякотных замаорскіх краях бусел сумуе па родных лугах.
5) Не салавей спявае шпак салаўіныя спевы старанна пераймае.

**A17.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:

1) Усё ў прыродзе на сваім месцы, усё мае сваё прызначэнне__ і нічога ў прыродзе нельга адкінуць.
2) Не магу налюбавацца начным небам: зіхацяць-пераліваюцца залатыя зоркі-гузічкі__ прышыў якія нехта вельмі шчыльна на глянцава-чорным палатне.
3) Выходжу з хаты і бачу: у нябесным моры вецер гоніць хмары, якія нагадваюць караблі__ і якія дазваляюць ма́рыць.
4) Не пацеркі па імшарынах рассыпаны, і чырванеюць па імшарынах не рубіны__ чаруюць вока рубінавыя журавіны.
5) Свой лёс у кожнай песні, але__ калі песню склаў народ, то жыць яна будзе вечна.

**А18.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*Зірнуўшы на гарлачыкі, дзядуля сказаў «У маім дзяцінстве кветкамі і каранямі жоўтага гарлачыка лячылі кашаль»*

1) коска;
2) двукроп'е;
3) працяжнік;
4) кропка;
5) пытальнік.

## Частка *В*

**В1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*світар, рачны, эталон, канцэлярыя, дрэваапрацоўка.*

**В2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*вуглекіслы, мядовы, сеанс, мяккаваты, бязветраны.*

**В3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*зарадка, запушчаны, верталёччык, капусны, пераказчык.*

**В4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*пачуццё, камісія, рассейваць, узбярэжжа, гадзіннік.*

**В5.** З прапанаваных лічэбнікаў вызначце той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*шэсцьдзесят, дзвесце, семсот, дзявяцера, трыццаць.*

**В6.** З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

*(**у**) **дзень** святочны, (**што**) **вечар** плаваць, час (**ад**) **часу** наведваць, ставіцца (**па**) **добраму**, пяць метраў (**у**) **абхват**.*

**В7.** З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:
*Не магу (не, ні) радавацца вясёлцы пасля дажджу.*

**В8.** З прапанаваных слоў (формаў слоў) вызначце і запішыце тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе:
*дыхаецца, раніца, чытаю, паведамілі, рашаюць.*

**В9.** Вызначце, якія канчаткі маюць прапанаваныя дзеясловы ў форме абвеснага ладу 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Адгароджваць. | **1.** -ем. |
| **Б.** Несці. | **2.** -ам. |
| **В.** Касіць. | **3.** -ім. |
| **Г.** Шаптаць. | **4.** -ым. |
| | **5.** -ём. |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Пераправа. | **1.** Суфіксальны. |
| **Б.** Дзяржкантроль. | **2.** Асноваскладанне. |
| **В.** Зверху. | **3.** Абрэвіяцыя. |
| **Г.** Дарожны. | **4.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |
| | **5.** Прыставачна-суфіксальны. |

**В11.** Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ... галава.<br>**Б.** ... песня.<br>**В.** ... рука.<br>**Г.** ... скрыпка. | **1.** Правая<br>**2.** Прыгожая<br>**3.** Першая<br>**4.** Доўгая<br>**5.** Светлая |

## Тэкст да заданняў В12 – В22

(1) *Ельня — балотны масіў, адзін з найбуйнейшых у Беларусі комплексаў верхавых і пераходных балот.* (2) *У параўнанні з Ельняй жыццё чалавека, можна сказаць, пылінка: балотам каля 9000 гадоў.*

(3) *Ельня — гэта 25 301 гектар прыроды, балансу якой амаль ніколі не парушалі людзі.* (4) *Гэта край, які зберагае для нас 118 найпрыгажэйшых азёр і тры дзівосныя ракі.* (5) *Край, што дае прытулак 130 відам птушак, у тым ліку і такім рэдкім, як чарнаваллёвая гагара, арлан-белахвост і чорны бусел.* (6) *А яшчэ балоты аблюбавала каля 6000* ***тых*** *шэрых жураўлёў, якія кормяцца тут перад кожным сезонам міграцыі.* (7) *Створаны на тэрыторыі Ельні заказнік атрымаў статус Рамсарскіх угоддзяў.*

(8) *Пасярод балот Ельні пракладзены найцікавейшыя маршруты.* (9) ***Асноўны*** *і самы лёгкі — экасцежка.* (10) ***Яна*** *ўяўляе сабой драўляны* ***насціл*** *з поручнямі і мае працягласць 1,5 кіламетра.* (11) *На экасцежцы збудавана назіральная вышка і прадугледжаны прыпынак, каб падарожныя маглі адпачыць.* (12) *Для аматараў адправіцца ў глыб балота таксама прапануецца шмат (неабычных, незвычайных) маршрутаў.* (13) *Адны з іх пешаходныя: «Ельненскі востраў», «Курганістае», «Лопухі», «Таборы», «Азяраўкі-Ельня».* (14) *Другія веласіпедныя: «Зялёныя», «Ельненская кругасветка» і іншыя.* (15) ***Атрымаць*** *задавальненне ад маршрутаў, паверце, зможа кожны.* (16) *Казачная Ельня вартая таго, каб хоць раз у жыцці ацаніць яе* ***прыгажосць****.* (17) *Гэты старажытны край заслугоўвае таго, каб пра яго беларускія мастакі слова складалі легенды і казкі.*

**В12.** Вызначце правільнае сцвярджэнне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1.

1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст навуковага стылю;
3) тэкст гутарковага стылю;
4) тэкст публіцыстычнага стылю;
5) тэкст мастацкага стылю.

**В13.** З двух слоў, выдзеленых у ***10-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***9-га*** і ***10-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***10-м*** сказе.

**В14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***12-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***12-м*** сказе.

**В15.** Знайдзіце ў ***17-м*** сказе тэксту слова, у якім ***3*** мяккія зычныя гукі. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***17-м*** сказе.

**В16.** Запішыце выдзелены ў ***16-м*** сказе тэксту назоўнік у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**В17.** Запішыце выдзелены ў ***9-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**В18.** Запішыце выдзелены ў ***6-м*** сказе тэксту займеннік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**В19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***15-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**В20.** Вызначце ў ***8-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

**В21.** Вызначце ў ***11-м*** сказе тэксту слова, якое мае нулявы канчатак. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***11-м*** сказе.

**В22.** Вызначце ў ***8-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***8-м*** сказе.

# ВАРЫЯНТ 2

## Частка А

**А1.** Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана лексічнае значэнне выдзеленых слоў:

1) ***прывабны*** луг — *‘які зачароўвае сваім выглядам’*;
2) ***дакла́дны*** пераклад — *‘поўнасцю адпаведны якім-небудзь патрабаванням’*;
3) новы ***дыван*** — *‘прадмет мяккай мэблі’*;
4) ***непакоіцца*** за брата — *‘быць спакойным’*;
5) пабудаваць ***сёлета*** — *‘у гэтым годзе’*.

**А2.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:

1) зорка ***(А/а)льтаір***;
2) возера ***(Н/н)ешчарда***;
3) вядомы ***(Б/б)абруйчанін***;
4) піражнае ***«(Б/б)ульба»***;
5) дрэва ***(С/с)асна***.

**А3.** Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар:

1) міжнародны сімпозі<u>*ў*</u>м;
2) гала<u>*ў*</u>ны банк;
3) каля <u>*Ў*</u>ральска;
4) залу прыбралі, <u>*у*</u>прыгожылі;
5) старанна працава<u>*ў*</u>.

**А4.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) вылсоў’е;
2) праменчык;
3) верабыны;
4) пад’есці;
5) кампаньён.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) машынабудаванне;
2) паў-апельсіна;
3) горад-пабрацім;
4) Неміровіч-Данчанка;
5) гідра-касцюм.

**А6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:

1) ***(Паўднёва) Атлантычнае*** цячэнне;
2) ***(асабліва) яркі*** світанак;
3) ***(добра) сумленны*** працаўнік;
4) ***(двух) камерны*** халадзільнік;
5) ***(бела) зялёны*** сарафан.

**А7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не***, ***ні*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:

1) ***(не) чуваны*** поспех;
2) ***(не) прапусціўшы*** прэм’еры;
3) ***(ні) як*** не распагоджвалася;
4) грыбы ***(не) пасушаны***;
5) ***(не) глыбокае***, але чыстае возера.

**А8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) паднесці да дзвярэй;
2) пайсці ў ягады;
3) жартаваць з сястрычкі;
4) чатыры пятых ураджаю;
5) сонечныя праменні.

**А9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Чароўны спявак — жаваранак.
2) Лірнік, дарэчы, — гістарычная назва вандроўнага беларускага музы́кі-песняра.
3) Падарожнічаць — мой любімы занятак.
4) Конік раптам — круць улева.
5) Катэхізіс — форма падачы матэрыялу ў пытаннях і адказах.

**А10.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Сказанае ні ў пяць, ні ў дзесяць горшае за маўчанне.
2) То малінавыя дзялянкі, то брусянічныя палянкі клічуць у лес.
3) Бусел, і жораў, і чапля любяць паласавацца рыбай.
4) З бяздоннага, жнівеньскага неба ішоў зорны дождж.
5) У вольны час я чытаю або вышываю.

**А11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):

1) Сельдэрэй вядомы__ як старажытная культурная расліна, якую грэкі вельмі паважалі і адлюстроўвалі на манетах.
2) Дзень__ як дзень, але не без светлых хвілін і надзей.
3) У бярозку маланка не б'е, бярозку__ быццам мілае дзіцятка__ беражэ.
4) У начным небе зоркі__ нібы забылі запаліцца.
5) Залівістай__ што званочак__ песняй сустракае вячэрнюю зару малінаўка.

**А12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:

1) Тонкія галінкі каліны__ пасаджанай дзядулем ля самай хаты__ ціхенька пастуквалі ў аконную шыбу.
2) Слухалі вучні легенду пра Нясвіжскі замак__ затаіўшы дыханне.
3) Пісьменнік і літаратуразнаўца__ Алег Антонавіч Лойка пакінуў у спадчыну будучым пакаленням літаратуразнаўчыя, крытычныя, вучэбныя і мастацкія творы.
4) Бегучы насустрач Юрку__ кот Барсік спадзяваўся, што хлопец нясе ў вядзерцы некалькі злоўленых акунёў.
5) Запрашае да сябе ў госці ў любую пару года Белавежская пушча__ музей беларускай прыроды.

**А13.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы (улічыце, што пабочныя словы знакамі прыпынку не выдзелены):

1) Ласкавае слова нават коціку прыемнае.
2) Добрая слава даражэйшая аднак за багацце.
3) Апетыт вядома прыходзіць у час яды.
4) Родныя краявіды з'яўляюцца паверце найцікавейшай карціннай галерэяй.
5) На сонцы раса́ можа зіхацець ярчэй за брыльянты.

**А14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх прапушчаны знак прыпынку:

1) Ціхія ночы і спеўныя світанні.
2) Ідзе рыбачыць чапля і жораў жыруе, і бусел у ботах тупае па балоце.
3) Мама песню заспявае і сум адразу прападае.
4) У чэрвені канюшына пахне мёдам і пачынаюць суніцы чырванець.
5) Як зіхацяць люстэркі нашых чыстых азёр і як пахне жывіцай кожны наш бор!

**А15.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Каб усюды паспяваць спяшаюся кожны дзень сонейка прывітаць.
2) Каляды, святкаванне якіх пачынаецца з урачыстай вячэры 6 студзеня, адкрываюць новы цыкл беларускіх народных свят.
3) Сапраўднымі залацінкамі сярод фальклорных твораў, якія мы любім, і якія мы старанна захоўваем, з'яўляюцца загадкі.
4) Кажуць, што калі рабіна красуе позна, восень будзе цёплай.
5) Дзе ты вымавіў сваё першае слова, там твая жыццёвая аснова.

**А16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ], [ ].**

1) Зноў у агародчыках сланечнікі нізка схіляюць цяжкія галовы зноў жоўтымі ліхтарамі вісяць у садах спелыя яблыкі.
2) З блізкім чалавекам ёсць пра што пагаварыць з блізкім чалавекам ёсць аб чым і памаўчаць.
3) Блішчаць сенажаці травой-аксамітам хвалюецца возерам спелае жыта шум канюшыны ўзлятае з лагчын.
4) Не вогнішча палае за маім акном гарыць каліна ягадкамі рубінавымі.
5) Кожны дзень любуюся клёнам ля нашага дома і заўважаю гэта дрэва з'яўляецца сапраўдным барометрам.

**А17.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:

1) Падыходжу да дзядулевай хаты і чую: дзівосна гучаць цымбалы__ па струнах якіх тупацяць малаточкі.
2) Я люблю гай, і люблю я бор адвечны, дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі__ і дзе рассцілаюць елкі лапкі.
3) Будзе сонейка свяціць, і дажджы будуць ісці__ будзе жыта расці.
4) Водны аб'ект можа мець у розных народаў некалькі назваў, а__ калі ўзяць Заходнюю Дзвіну, то ў яе іх больш за дзесяць: Эрыдан, Рудон, Турунт, Танаіс, Дзюна, Вена, Даўгава і іншыя.
5) Зноў красуе жыта, зноў люцікі квітнеюць ды васількі__ і зноў чаруе водарная ліпа.

**А18.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*Гатуючы сняданак, бабуля ўспамінала «Некалі ў нашай вёсцы варылі суп у саганах ды ў рондалях»*

1) коска;
2) працяжнік;
3) двукроп'е;
4) кропка;
5) пытальнік.

## Частка В

**В1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*рэсора, цэнайтварэнне, бухгалтар, шчабятаць, экалогія.*

**В2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*жыццелюбства, цяплець, абеліск, бязмерны, месяц.*

**В3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*здагадка, уклаччык, аблашчаны, кантрасны, рэзчык.*

**В4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*журавіннік, каллекцыя, рассыпаць, мыццё, бязмежжа.*

**В5.** З прапанаваных лічэбнікаў вызначце той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*васямнаццаць, дзве, дзевяцьсот, семдзясят, шасцёра.*

**В6.** З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

***(што) тыдзень** наведваць, зразумець **(па) рознаму**, матэрыялаў **(у) абрэз**, перадаць з рук **(у) рукі**, **(у) вечар** летні.*

**В7.** З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:

*У альховых кустах прымасціўшыся, праспяваў да ранку салавей, (не, ні) разу не збіўшыся.*

**В8.** З прапанаваных слоў (формаў слоў) вызначце і запішыце тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе:

*пішу, заклікаюць, уздыхаецца, раўніна, дазволілі.*

**В9.** Вызначце, якія канчаткі маюць прапанаваныя дзеясловы ў форме абвеснага ладу 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Вязаць. | **1.** -ём. |
| **Б.** Саладзіць. | **2.** -ым. |
| **В.** Замаруджваць. | **3.** -ам. |
| **Г.** Класці. | **4.** -ем. |
| | **5.** -ім. |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Раслінны. | **1.** Прыставачна-суфіксальны. |
| **Б.** Дапамога. | **2.** Асноваскладанне. |
| **В.** Напалову. | **3.** Абрэвіяцыя. |
| **Г.** Медперсанал. | **4.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |
| | **5.** Суфіксальны. |

**В11.** Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ... гэта варта.<br>**Б.** ... гэта відана.<br>**В.** ... адбаўляй.<br>**Г.** ... і трэба. | **1.** Куды<br>**2.** Хоць<br>**3.** Дзе<br>**4.** Адкуль<br>**5.** Так |

### Тэкст да заданняў *В*12—*В*22

(1) *Па вузкай палявой сцежцы Міхась ішоў няспешна, з сумам думаючы пра* ***тыя*** *апошнія дзянькі, якія засталіся ад лета.*

(2) *Хутка наляцяць парывістыя вятры.* (3) *Сарвана* ***імі****, узвеяна будзе мноства вогненных* ***лістоў****, высока ўскалыхнуць яны птушыныя чародкі і, прыспешваючы, пагоняць іх адвечным асеннім шляхам туды, дзе нараджаецца туга па родных мясцінах.* (4) *Запала́е ўсё навокал: ад ломкай рыжай пожні і высланых лісцем сцежак да вершалін дрэў.* (5) *Прымусіць слязлівая восень заплакаць дажджамі нізкія хмары.*

(6) *Пасля пачнецца зіма, якая можа* ***абагнаць*** *восень.* (7) *І няхай сабе абганяе, бо павінна ж разліцца марозная цішыня па зямлі.* (8) ***Бязгучнасць*** *скуе рачулкі, палі, дарогі.* (9) *Аднойчы з неба пасыплецца першы снег-крупасей.* (10) *Умомант усё пачысцее.* (11) *Тады чакай* ***бясконцых*** *дзівосаў.* (12) *То зіхоткі снег асыпле плечы, то ўгрузнеш ботамі ў мяккім снежным пухавіку, то (паскальзнешся, паслізнешся) на лядку, то замрэш ад чароўных гукаў, не адразу і ўразумеўшы, што гэта вецер іграе на сваім грабянцы, кранаючыся празрыста-блакітных ледзяшоў на страсе.* (13) *Ды ці мала цудаў, якія здзіўляюць нас узімку!*

(14) *Пра вясну і казаць няма чаго.* (15) *Вясной кожнае імгненне звязана хоць з невялічкім, але цудам.* (16) *Цудам першага ручайка, які адхуквае сярод снегу сваю сцяжынку.* (17) *Цудам першай праталінкі, першага далікатнага парастка, альховага лісціка і, безумоўна, першай пралескі.* (18) *Цудам абуджэння магутнай ракі.*

(19) *«І тады на змену вясне зноў прыйдзе лета», — сказаў уголас Міхась і пакрочыў весялей.*

**В12.** Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:

1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст публіцыстычнага стылю;
3) тэкст мастацкага стылю;
4) тэкст навуковага стылю;
5) тэкст гутарковага стылю.

**В13.** З двух слоў, выдзеленых у ***3-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***2-га*** і ***3-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***3-м*** сказе.

**В14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***12-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***12-м*** сказе.

**В15.** Знайдзіце ў ***5-м*** сказе тэксту слова, у якім ***3*** мяккія зычныя гукі. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***5-м*** сказе.

**В16.** Запішыце выдзелены ў ***8-м*** сказе тэксту назоўнік у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**В17.** Запішыце выдзелены ў ***11-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**В18.** Запішыце выдзелены ў ***1-м*** сказе тэксту займеннік у форме давальнага склону множнага ліку.

**В19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***6-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**В20.** Вызначце ў ***16-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

**В21.** Вызначце ў ***5-м*** сказе тэксту слова, якое мае нулявы канчатак. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***5-м*** сказе.

**В22.** Вызначце ў ***15-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***15-м*** сказе.

# ВАРЫЯНТ 3

## Частка A

**A1.** Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана лексічнае значэнне выдзеленых слоў:
1) прыгожая ***рэч*** — *'мова'*;
2) ***неабсяжны*** прастор — *'невялікі па працягласці'*;
3) ***ставіцца*** з даверам — *'праяўляць, выражаць свае адносіны да каго-небудзь'*;
4) выйсці ***зацемна*** — *'да світання, пакуль яшчэ цёмна'*;
5) ***утульны*** кабінет — *'такі, у якім прыемна знаходзіцца'*.

**A2.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:
1) малады ***(Г/г)амяльчанін***;
2) планета ***(М/м)еркурый***;
3) вафлі ***«(В/в)іцьба»***;
4) дрэва ***(Д/д)уб***;
5) возера ***(Н/н)арач***.

**A3.** Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар:
1) прыгожа намалява<u>***ў***</u>;
2) Далёкі <u>***Ў***</u>сход;
3) агульная дыкто<u>***ў***</u>ка;
4) таматны со<u>***ў***</u>с;
5) зялёныя палі, <u>***у***</u>згоркі.

**A4.** Адзначце правільна напісаныя словы:
1) ласьён;
2) сямья;
3) агенчык;
4) салаў'іны;
5) з'ява.

**A5.** Адзначце правільна напісаныя словы:
1) сенанарыхтоўка;
2) касманаўт-дублёр;
3) Салтыкоў-Шчадрын;
4) вела-траса;
5) паў-ананаса.

**A6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:
1) ***(бясконца) доўгі*** шлях;
2) ***(Заходне) Сібірская*** раўніна;
3) ***(двух) гадовы*** хлопчык;
4) ***(чорна) сіні*** парасон;
5) ***(шмат) павярховы*** дом.

**A7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не, ні*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:
1) ***(не) завёўшы*** машыны;
2) ***(не) буйныя***, але спелыя брусніцы;
3) падарункі ***(не) запакаваны***;
4) ***(не) змаўкальны*** звон;
5) ***(ні) хто*** не адмовіўся.

**A8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
1) пайсці ў арэхі;
2) дзве трэціх кнігі;
3) тоўстыя карэнні;
4) падплыць да берага;
5) смяяцца з сябе.

**A9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Катацца на лыжах — цудоўны адпачынак.
2) Ферт — устарэлая назва літары «ф».
3) Адвечная каштоўнасць — лес.
4) Эльдарада, зразумела, — міфічная краіна.
5) Вавёрка — скок на дрэва.

**A10.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Для інфармавання чалавецтва пра надзвычай рэдкія віды раслін або жывёл створаны Чырвоныя кнігі.
2) У бялюткіх, майскіх садах мілата.
3) Пахне хлебная скарынка цёплым ветрыкам, і дажджынкай, і сонца промнем залатым.
4) Начное неба то цёмнае, то бліскучае.
5) Ні кала, ні двара ў гультая.

**A11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):

1) Мароз__ як мароз: крыху шчыпаў за шчокі ён і крышачку — за нос.
2) Лес пасля дажджу__ нібы памаладзеў.
3) У сонечны дзянёк дзівосна__ быццам свечкі__ гараць на елках шышкі.
4) Цёплая__ што сырадой__ азёрная вада летнім ранкам.
5) Кіліманджара нам вядомая__ як гара з самай высокай у свеце вяршыняй, па якой можна гуляць.

**A12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:

1) Кацярынка паведаміла__ не мігнуўшы вокам, што марожанае са стала сцягнуў Мухтар.
2) Мы многія песні свае прысвячаем сваёй Беларусі__ любімаму краю.
3) Адчуваючы цяпло__ выпаўзаюць з хадоў-лабірынтаў лясныя мурашы.
4) Аўтарам паэмы «Тарас на Парнасе»__ надрукаванай упершыню ў 1889 годзе__ лічыцца Канстанцін Вераніцын.
5) Прыгожая рака__ Ушача, як і ўсе рэкі ў нашым краі, мае цікавую гісторыю.

**A13.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы (улічыце, што пабочныя словы знакамі прыпынку не выдзелены):

1) Найлепшыя ўспаміны ў мяне відаць звязаны са школай.
2) Снег уявіце не адзін раз выпадаў у маі.
3) Мне ў родным лесе вядома кожная грыбная баравіна.
4) Чалавека аднак корміць праца.
5) Здароўе нават за грошы даражэйшае.

**A14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх прапушчаны знак прыпынку:

1) Колькі му́зыкі чароўнай у родным мове і колькі ў ёй душэўнай цеплыні!
2) Ужо вечар ахінае двары і звіняць музы́кі-камары.
3) Духмяны бэз і пахкая чаромха.
4) Гром хмару моцна страсянуў і дождж з яе лінуў.
5) Салавей выводзіць трэлі і свішча дрозд, і весела шчабечуць ластаўкі.

**A15.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Калі ўзыходзіць сонейка залатымі становяцца воблакі.
2) Ёсць творы, якія кожны раз чытаеш па-новаму.
3) Шмат рэдкіх парод раслін, многія з якіх занесены ў Чырвоную кнігу, расце вакол Свіцязі.
4) У XII стагоддзі ў сцены храмаў умуроўвалі керамічныя пасудзіны, якія паляпшалі акустыку памяшкання, і якія аблягчалі мураваную сцяну.
5) Заўважана, што калі на Спас ідзе дождж, будзе нямала грыбоў.

**A16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ], [ ].**

1) Ідзе вясна ў шумлівых водах ідзе вясна ў звонкім срэбры ручаёў.
2) Слухаю перапёлачак і веру хтосьці падарыў ім свісцёлачкі.
3) Дрэвы ў лесе захутаны ў шалікі белыя рассцелены ў полі белы дыван у небе хмаркі сабраліся белыя.
4) Сустракае з дарогі мяне гаючай вадой калодзеж з вечкам ківае-вітаецца са мной галінкамі кучаравы клён.
5) Не музы́ка на дудачцы іграе вецер у коміне завывае.

**A17.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:

1) Лондан лічыцца горадам дажджоў, але__ калі паглыбіцца ў статыстыку надвор'я, то можна заўважыць, што Мінск больш падышоў бы пад гэта апісанне.
2) Мне некалі тата падказаў вельмі важную рэч: сяброў__ лёсам якія будуць пасланы, не трэба дзяліць на блізкіх ці далёкіх.
3) Галілей быў першым, хто паглядзеў на Месяц у тэлескоп__ і хто ўбачыў: на Месяцы ёсць горы і раўніны.
4) Яшчэ кветкі не раскрыліся, яшчэ дрэмле возера ў бавоўняным тумане__ і яшчэ ў лесе ні гуку.
5) Павісла над полем цёмная хмара, і ў самым цэнтры яе паласнула разы са два маланка__ дажджу пакуль не было.

**A18.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*Мая бабуля любіць паўтараць «Пра чалавека трэба меркаваць па яго справах»*

1) двукроп'е;
2) кропка;
3) коска;
4) працяжнік;
5) пытальнік.

## Частка *В*

**В1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*прэснаводны, раменны, экспанат, почэрк, майстар.*

**В2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*цяжкаваты, раннеспелы, бязгучны, ляднік, сезон.*

**В3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*карысны, газеччык, перавозчык, пяшчотны, суседка.*

**В4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*аллегорыя, бясследна, узвышша, багацце, маліннік.*

**В5.** З прапанаваных лічэбнікаў вызначце той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*чатырыста, шэсцьсот, пяцёра, восемдзясят, шаснаццаць.*

**В6.** З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

***(у) высь*** *нябесную,* ***(што) раніцы*** *бегаць, размаўляць* ***(па) дзелавому****, працаваць* ***(у) адзіночку****, дзень* ***(у) дзень*** *трэніравацца.*

**В7.** З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:

*Дзе б я (ні, не) быў далёка, у сэрцы ты жыла, знаёмая сцяжынка да роднага сяла.*

**В8.** З прапанаваных слоў (формаў слоў) вызначце і запішыце тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе:

*святкую, ікаецца, надрукавалі, працуюць, ноч.*

**В9.** Вызначце, якія канчаткі маюць прапанаваныя дзеясловы ў форме абвеснага ладу 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Дзяліць. | **1.** -ам. |
| **Б.** Падсольваць. | **2.** -ем. |
| **В.** Казаць. | **3.** -ём. |
| **Г.** Везці. | **4.** -ым. |
| | **5.** -ім. |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Педсавет. | **1.** Асноваскладанне. |
| **Б.** Знізу. | **2.** Суфіксальны. |
| **В.** Павага. | **3.** Абрэвіяцыя. |
| **Г.** Разумны. | **4.** Прыставачна-суфіксальны. |
| | **5.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |

**B11.** Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ... душу.<br>**Б.** ... ад сэрца.<br>**В.** ... навылёт.<br>**Г.** ... слова. | **1.** Адлягло<br>**2.** Адвесці<br>**3.** Бачыць<br>**4.** Браць<br>**5.** Вы́красліць |

**Тэкст да заданняў *B12–B22***

(1) *Золак.* (2) *Роўнай стужкай лясной дарогі спяшаецца цётка Ганна ў горад да ўнукаў.* (3) *Вільготнае паветра настоена на водары белых фіялак.* (4) *З левага боку далятае да дарогі сунічная* ***духмянасць***.

(5) *«Крышку прыпазнюся, затое пачастую родных сунічкамі», — вырашыла цётка і звярнула ў лес.* (6) *Часу, каб* ***назбіраць*** *ягад, спатрэбілася няшмат: палянка, усыпаная спелымі суніцамі, была недалёка.* (7) *Уладкаваўшы пачастунак у сумку (тут галоўнае — не пацерці!), Ганна, шчаслівая, выйшла на дарогу і працягнула свой шлях.*

(8) *Раніца выдалася на славу.* (9) *Спачатку паўсюль стаяла прыемная цішыня.* (10) *Пасля ўзыходу сонейка сваім ледзь (улавімым, улоўным) подыхам цішыню парушыў лёгкі ветрык, а ўсё навакольле напоўнілася чароўнымі мелодыямі крылатых салістаў.* (11) *Раней за іншых пачалі славіць світанак заранка і берасцянка.* (12) ***Іх*** *серабрыстыя песні тут жа абудзілі малінаўку, а* ***яшчэ*** *— дразда.* (13) *Не праспала світання і зязюля.* (14) *Адтуль, дзе красаваліся каралеўскія сосны, даляцеў чуллівы спеў івалгі.* (15) *Пільная і палахлівая птушка заўсёды трымаецца ў цяністых месцах і рэдка трапляецца на вочы.* (16) *А ўбачыць яе Ганне хацелася, бо цётка не раз чула апавяданні пра незвычайную грацыю і апярэнне птушкі, пра* ***тыя*** *прыкметы, што бытуюць у народзе: чалавека, які сустрэне івалгу, чакае вялікая ўдача, ён будзе шчаслівы.*

(17) *Распазнаць шматлікіх і зусім* ***розных*** *спевакоў у дзівосным лясным хоры цётка не змагла.* (18) *Але важна было іншае: навокал ад птушынага канцэрта стала светла і радасна.* (19) *Гэтым святлом ды радасцю была перапоўнена і яе душа.*

**B12.** Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:

1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст навуковага стылю;
3) тэкст гутарковага стылю;
4) тэкст публіцыстычнага стылю;
5) тэкст мастацкага стылю.

**B13.** З двух слоў, выдзеленых у ***12-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***11-га*** і ***12-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***12-м*** сказе.

**B14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***10-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***10-м*** сказе.

**B15.** Знайдзіце ў ***14-м*** сказе тэксту слова, у якім ***3*** мяккія зычныя гукі. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***14-м*** сказе.

**B16.** Запішыце выдзелены ў ***4-м*** сказе тэксту назоўнік у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**B17.** Запішыце выдзелены ў ***17-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**B18.** Запішыце выдзелены ў ***16-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону множнага ліку.

**B19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***6-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**B20.** Вызначце ў ***10-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

**B21.** Вызначце ў ***11-м*** сказе тэксту слова, якое мае нулявы канчатак. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***11-м*** сказе.

**B22.** Вызначце ў ***3-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***3-м*** сказе.

## ВАРЫЯНТ 4

### Частка А

**А1.** Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана лексічнае значэнне выдзеленых слоў:

1) ***небяспечны*** вецер — ‘*які прыносіць шкоду*’;
2) хутка ***ўстаць*** — ‘*стаміцца*’;
3) адносіцца ***ашчадна*** — ‘*беражліва, эканомна*’;
4) ***імклівы*** бег — ‘*вельмі хуткі*’;
5) далёкі ***свет*** — ‘*прамяністая энергія, якая вылучаецца сонцам*’.

**А2.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:

1) зорка ***(В/в)ега***;
2) юны ***(П/п)алачанін***;
3) шакалад ***«(С/с)партак»***;
4) дрэва ***(В/в)ольха***;
5) возера ***(Д/д)рывяты***.

**А3.** Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар:

1) шырокі ***Ў***рал;
2) любімая прыма***ў***ка;
3) хораша спява***ў***;
4) вялікі стра***ў***с;
5) вышывала кветкі, ***у***зоры.

**А4.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) здароў’е;
2) пьедэстал;
3) медальён;
4) каменчык;
5) пад’ёмны.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) працаздольнасць;
2) баль-маскарад;
3) паў-абрыкоса;
4) стэрэа-апаратура;
5) Бялыніцкі-Біруля.

**А6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:

1) ***(доўга) тэрміновы*** адпачынак;
2) ***(пяці) градусны*** мароз;
3) ***(шэра) ружовы*** партфель;
4) ***(Паўднёва) Кітайскае*** мора;
5) ***(адносна) спакойны*** сон.

**А7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не, ні*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:

1) ***(ні) дзе*** не памыліўся;
2) дакументы ***(не) аформлены***;
3) ***(не) паспрабаваўшы*** дранікаў;
4) ***(не) згасальнае*** святло;
5) ***(не) вялікія***, але салодкія яблыкі.

**А8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) тры чацвёртых пірага;
2) падбегчы да прыпынку;
3) пажоўклыя лісці;
4) пайсці ў грыбы;
5) кпіць з лайдака.

**А9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Бабуля лыжкі — шух у шафу.
2) Зрабіць адкрыццё — мая мара.
3) Дзівосная прыродная з’ява — вясёлка.
4) Каліна — часты вобраз беларускіх народных балад.
5) Грачанікі, паверце, — смачныя бліны.

**А10.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Ні спору, ні ўмалоту ў лежабокі.
2) Восень то на дрэвах лісточкі фарбуе, то паўсюль пляце павуцінне.
3) Купалле ў народзе лічыцца святам агню, і вады, і раслін.
4) Жвавых вераб’ёў або мітуслівых сінічак можна ўбачыць зімовай раніцай ля кустоў бэзу.
5) Халоднай, ранішняй расы́ чакалі верасы.

**А11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):

1) Хата__ як хата, але на гасціннасць багатая.
2) У першы свой дзень зіма__ чыбы ўвесь снег высыпала.
3) Крыт вядомы__ як востраў, дзе самым непасрэдным чынам пераплятаюцца рэальнасць і выдумка пра герояў і багоў.
4) Па дварах старанна__ што паштальён__ лісты разносіць асенні вецер.
5) Хмара дзіўна__ быццам абажурам__ прыкрыла сонейка.

**А12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:

1) На зямлі__ нам лёсам дадзенай__ мы жывём, як жылі нашы мудрыя прадзеды.
2) У бяскрайніх прасторах Ціхага акіяна знаходзіцца самая аддаленая населеная частка сушы__ востраў Пасхі.
3) Ідучы праз сады__ мы шкадуем заўжды, што на год вясна толькі адна ў нас.
4) Наш славуты пісьменнік__ Якуб Колас свае самыя любімыя творы пісаў дзесяцігоддзямі.
5) Не будзе чым пахваліцца восенню, калі вясной сядзець__ склаўшы рукі.

**А13.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы (улічыце, што пабочныя словы знакамі прыпынку не выдзелены):

1) Добрыя справы чалавека мяркую яму дабром заўсёды вернуцца.
2) Вясной нават рэха званчэй адклікаецца.
3) Высокі лес відаць здалёк.
4) Якая дзівосная паслухайце музыка ў майскім садзе!
5) Веды аднак заўсёды будуць у пашане.

**А14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх прапушчаны знак прыпынку:

1) Зноў у лес кліча на світанні грыбны пах і вабіць водар спелых ягад.
2) Гараць купальскія агні і па рацэ плывуць дзявочыя вяночкі, і папараць-кветку шукае хтосьці.
3) Плеценая лавачка і нізенькі ліхтар.
4) Які цудоўны дзень вясновы і які дзівосны хор птушыны!
5) Зазірнула ранішняе сонейка ў люстра рачное і рака зазіхацела.

**А15.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Нарач адносіцца да азёр, якія не зарастаюць раслінамі.
2) Калі ёсць здольнасці трэба абавязкова іх развіваць.
3) Люблю я ціхія вершы, дзе няма крыку, і дзе кожнае слова адрасавана сэрцу.
4) Заўважана, што калі ў чаромхі шмат кветак, будзе мокрае лета.
5) Адным з першых уладальнікаў духоў, парфумерная кампазіцыя якіх захоўвалася ў тайне, быў Напалеон I.

**А16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ], [ ]**.

1) Не мора побач з лесам шуміць жыта спелымі каласамі шалясціць.
2) Вясеннія ручайкі срэбнымі стужкамі ззялі на сонцы вясеннія ручайкі весела гаманілі ў сваіх беражках.
3) Чытаю вершы Пімена Панчанкі і разумею жыве ў яго творах праўда.
4) Бярозы ў родным краі красу ўзносяць да нябёс у родным краі мы працай адданай ствараем дабро.
5) Расплятае лета косы зоркі падаюць у росы пахнуць кветкамі лугі.

**А17.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:

1) Хацела рэха палятаць па дуброве, але__ калі яно далящела да магутных дубоў, то не змагло прабіцца праз іх магутныя галіны.
2) Зноў прабеглі летнія дзянькі, зноў набліжаецца той час, калі пакрываюцца золатам лясы__ і калі водарам антонавак напаўняцца сады.
3) Падышоўшы да самага лесу, спыняюся: стаіць на ўскрайку адзінокая хатка__ гаспадар якой, па ўсім відаць, працуе лесніком.
4) Згарнуліся парасоны адуванчыкаў, і кветкі мацней запахлі__ чакай дажджу.
5) Няхай у кожнага будзе свой дом, няхай ён будзе светлы__ і няхай кожны куточак у ім будзе ўтульны.

**А18.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*У пачатку ўрока настаўнік паведаміў «Тамаш Зан складаў творы на аснове беларускага фальклору і міфалогіі»*

1) двукроп'е;
2) коска;
3) працяжнік;
4) кропка;
5) пытальнік.

## Частка *В*

**В1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*эстафета, брэзент, рэдкавалосы, фламастар, выкраслiць.*

**В2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*бязмежны, кляновы, алегорыя, памятаць, краезнаўства.*

**В3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*заказчык, колькасны, укладка, пераплёччык, гушчыня.*

**В4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*імянiннiк, падарожжа, бессiмптомны, каллектыў, жыццё.*

**В5.** З прапанаваных лічэбнікаў вызначце той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

*сямнаццаць, трыста, восемсот, пяцьдзесят, абедзве.*

**В6.** З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

*апранацца **(па) сучаснаму**, **(у) восень** цёплую, прапанаваць **(у) абмен**, **(што) год** падарожнічаць, дзень **(пры) дні** працаваць.*

**В7.** З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:

*Пра што толькі (ні, не) ма́рыцца ў салаўіныя вечары!*

**В8.** З прапанаваных слоў (формаў слоў) вызначце і запішыце тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе:

*збіраюць, пазіраю, сонца, змайстравалі, думаецца.*

**В9.** Вызначце, якія канчаткі маюць прапанаваныя дзеясловы ў форме абвеснага ладу 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Падлічваць. | **1.** -ім. |
| **Б.** Месці. | **2.** -ем. |
| **В.** Калыхаць. | **3.** -ём. |
| **Г.** Бяліць. | **4.** -ым. |
| | **5.** -ам. |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Збоку. | **1.** Прыставачна-суфіксальны. |
| **Б.** Ветурач. | **2.** Абрэвіяцыя. |
| **В.** Законны. | **3.** Асноваскладанне. |
| **Г.** Абарона. | **4.** Суфіксальны. |
| | **5.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |

**B11.** Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ... адбауляй. | **1.** Хіба |
| **Б.** ... бокам. | **2.** Абы |
| **В.** ... дзень да вечара. | **3.** Вось |
| **Г.** ... дык штука. | **4.** Хоць |
| | **5.** Пад |

## Тэкст да заданняў *B*12–*B*22

(1) *«Кнігі жывуць да* ***тых*** *часін, пакуль іх не толькі чытаюць, але і перачытваюць», — гаварыў Якуб Колас.* (2) *Бясконца любімым і самым (пазнавальным, пазнавацельным) творам беларускай літаратуры, якія чытаецца і перачытваецца з вялікім захапленнем, з'яўляецца паэма «Новая зямля».* (3) *Радок «Мой* ***родны*** *кут, як ты мне мілы!..» вядомы і дарагі кожнаму з нас.* (4) *Першы беларускі раман у вершах, беларускі нацыянальны эпас, «адысея» беларускай літаратуры, энцыклапедыя сялянскага жыцця, песня песняў беларускага народа — так называюць Коласаву паэму, жамчужыну беларускага прыгожага пісьменства.*

(5) *Шлях «Новай зямлі» ад задумы да асобнага выдання нельга* ***назваць*** *простым.* (6) *Працу над паэмай Якуб Колас распачаў у сакавіку 1911 года, а недзе ў маі 1923 года яна выйшла з друку асобнай кнігай.*

(7) *Якуб Колас лічыў кнігу «Новая зямля» асновай сваёй паэтычнай творчасці.* (8) *Аўтар з радасцю дарыў* ***яе****, пакідаючы некалькі радкоў на памяць,* ***людзям*** *са свайго акружэння.* (9) *Сярод іх — блізкія пісьменніка, калегі па пяры, навукоўцы.* (10) *Першае з вядомых нам асобных выданняў з прысвячэннем належала бацьку Максіма Багдановіча — беларускаму этнографу, фалькларысту і мовазнаўцу.* (11) *Сёння гэта кніга захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі.*

(12) *Да стагоддзя з часу выпуску «Новай зямлі» Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа выдадзена факсіміле кнігі 1923 года.* (13) *Дзякуючы гэтаму праекту наш сучаснік мае* ***магчымасць*** *убачыць кнігу, аналагічную той, старонкі якой некалі гартаў сам паэт.*

**B12.** Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:

1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст публіцыстычнага стылю;
3) тэкст гутарковага стылю;
4) тэкст навуковага стылю;
5) тэкст мастацкага стылю.

**B13.** З двух слоў, выдзеленых у ***8-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***7-га*** і ***8-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***8-м*** сказе.

**B14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***2-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***2-м*** сказе.

**B15.** Знайдзіце ў ***9-м*** сказе тэксту слова, у якім ***3*** мяккія зычныя гукі. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***9-м*** сказе.

**B16.** Запішыце выдзелены ў ***13-м*** сказе тэксту назоўнік у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**B17.** Запішыце выдзелены ў ***3-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**B18.** Запішыце выдзелены ў ***1-м*** сказе тэксту займеннік у форме творнага склону множнага ліку.

**B19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***5-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**B20.** Вызначце ў ***13-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

**B21.** Вызначце ў ***5-м*** сказе тэксту слова, якое мае нулявы канчатак. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***5-м*** сказе.

**B22.** Вызначце ў ***12-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***12-м*** сказе.

# ВАРЫЯНТ 5

## Частка А

**А1.** Адзначце прыклады, у якіх правільна вызначана лексічнае значэнне выдзеленых слоў:

1) смачныя ***слíўкі*** – *'густы і тлусты верхні слой на малаку'*;
2) ***руплівы*** гаспадар – *'які імкнецца зрабіць як мага больш і лепш'*;
3) ***неблагі*** дзень – *'нядобры'*;
4) ***марудзіць*** з рамонтам – *'доўга не пачынаць справы'*;
5) існавала ***адвеку*** – *'з даўніх часоў'*.

**А2.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:

1) карэнны ***(М/м)інчанін***;
2) возера ***(С/с)віцязь***;
3) планета ***(М/м)арс***;
4) цукеркі ***«(Г/г)рыльяж»***;
5) дрэва ***(К/к)лён***.

**А3.** Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар:

1) сур'ёзны, ***у***думлівы вучань;
2) тлумачальны сло***ў***нік;
3) доўга чака***ў***;
4) Ганна ***Ў***сцінаўна;
5) правесці кансілі***ў***м.

**А4.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) паштальён;
2) пасляслоў'е;
3) з'есці;
4) пьеса;
5) струменчык.

**А5.** Адзначце правільна напісаныя словы:

1) авія-мадэль;
2) паў-агурка;
3) глебааднаўленне;
4) кабінет-музей;
5) Багданаў-Бельскі.

**А6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць праз злучок:

1) ***(абсалютна) выпадковы*** выбар;
2) ***(жоўта) карычневы*** альбом;
3) ***(Усходне) Еўрапейская*** раўніна;
4) ***(сямі) значны*** лік;
5) ***(мала) вядомы*** мастак.

**А7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не***, ***ні*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:

1) ***(не) злічоныя*** скарбы;
2) ***(не) атрымаўшы*** часопіса;
3) ***(ні) чым*** не нагадваў;
4) ***(не) шырокая***, але роўная дарога;
5) алоўкі ***(не) навостраны***.

**А8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) цешыцца з дзіцяці;
2) пайсці ў журавіны;
3) дзве пятых дарогі;
4) падвезці да бібліятэкі;
5) белыя крыллі.

**А9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Купалле – старажытнае свята.
2) Найсмачнейшыя ягады – лясныя суніцы.
3) Барсік раптам – шмыг на печ.
4) Бульба, бясспрэчна, – другі хлеб.
5) Дапамагаць сябрам – радасць.

**А10.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Галушкі гатуюць з дранай бульбы або з мукі.
2) Зноў плывуць па шырокіх, жытнёвых прасторах камбайны.
3) Ні свет, ні зара заспявала малінаўка.
4) Вялікую сілу маюць добрае слова, і ласкавы позірк, і лагодная ўсмешка.
5) Спяшаемся то ў лугі, то ў лясы паслухаць птушыныя галасы.

**A11.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):

1) Гучна__ нібы арган__ гром абвясціў навальніцу.
2) Звонкі__ што серабро__ голас у лясной крынічцы.
3) Адным ражком маладзік__ быццам зачапіўся за ялінку.
4) Востраў Эспаньёла вядомы__ як адзіны ў свеце востраў, дзе гняздзяцца хвалістыя альбатросы.
5) Зіма__ як зіма: ні разу не здзівіла нас яна.

**A12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць знак (знакі) прыпынку:

1) Першыя кнігі не маглі быць таннымі: кожную з іх перапісвалі на працягу некалькіх гадоў__ аздабляючы вокладку каштоўнымі камянямі і золатам.
2) Каб не ехаць__ на ноч гледзячы, падарожнікі затрымаліся ў леснічоўцы.
3) Губернатарскі сад__ закладзены ў Мінску ў канцы XVIII стагоддзя__ сёння ўсім нам вядомы як парк імя Максіма Горкага.
4) У ранішнім блакіце чароўна спявалі жаваранкі__ саліcты паднябесся.
5) Вядомы мастак__ Міхаіл Андрэевіч Савіцкі нарадзіўся на Віцебшчыне.

**A13.** Адзначце сказы, у якіх ёсць пабочныя словы (улічыце, што пабочныя словы знакамі прыпынку не выдзелены):

1) Без навукі нават лапця не спляцеш.
2) Колькі аднак мудрасці ў прыказках і ў прымаўках!
3) Чалавек лічу павінен паважаць законы прыроды.
4) Мне ў маёй роднай мове зразумела кожнае слова.
5) Добрай вестцы згадзіцеся ўсе рады.

**A14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх прапушчаны знак прыпынку:

1) Пройдуць дажджы ў ма́і і не хвалюйцеся тады пра ўраджаі.
2) Ужо месяц-пастушок на жалейцы грае і на нябесны муражок ён зорачкі збірае.
3) Васількове поле і рамонкавы луг.
4) Бальзамін расцвіў ярка-ружовымі кветкамі і жаўцее гарлюха ястрабковая, і цэлымі астраўкамі раскашу́е фіялка.
5) Як многа ў вёсцы неба і як многа сонца ў вёсцы!

**A15.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:

1) Люблю час, калі пух старых падушак вымятаюць з домікаў шпакі, і калі буслы буслянкі дружна ладзяць.
2) Каб мець сяброў навучыся сябраваць.
3) Ва ўсіх беларускіх вёсках, кожная з якіх мае цікавую гісторыю, абавязкова знойдзецца цікавы апавядальнік.
4) На паўднёвым усходзе з Нарачы выцякае рэчка, якую мясцовыя жыхары называюць Нарачанкай.
5) Вядома, што калі год багаты на шышкі, крыжадзюбы выводзяць птушанят і зімой.

**A16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ], [ ]**.

1) Уваходжу ў лес і бачу па крохкім лядку брыдуць магутныя ласі.
2) Ручаі гудуць напорыста распусцілі вербы голлейка на галінцы ціхім посвістам шпак вітае рана сонейка.
3) Не снег выпаў у ма́і занявесціліся яблыні ў маім краі.
4) Шалік на плечы бярозцы май накінуў завушнічкі жоўценькія ён бярозцы падарыў.
5) Зіхаціць на рэчках бездакорны зімовы крыштальззяе на вербах снежная вуаль.

**A17.** Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:

1) Не сонечныя зайчыкі імчацца па двары, і не коцяцца па двары камячкі жоўтай ваты__ нясуцца насустрач гаспадыні жвавенькія кураняты.
2) Вясну заўжды пачынаюць пралескі, вітаюць заўжды званочкі вясну__ і заўжды вясну шпакі абвяшчаюць.
3) Для сябе я вырашыў даўно: няма ў мяне права забыць той куток, дзе зведаў пяшчоту матулі__ і дзе я зрабіў першы свой крок.
4) Лёгкае пяро, але__ калі яго на страху́ хто пажадае закінуць, то наўрад ці зможа.
5) Паэма «Тарас на Парнасе» перакладзена на розныя мовы, яе палюбілі тэатральныя сцэны, ёй адкрылі ў Гарадку скульптурную кампазіцыю__ назва якой сугучная назве твора.

**A18.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*У пачатку заняткаў кіраўнік гуртка паведаміў «І ў Кітаі, і ў Японіі дзявяты дзень дзявятага месяца прысвечаны хрызантэме»*

1) двукроп'е;
2) коска;
3) працяжнік;
4) пытальнік;
5) кропка.

## Частка *B*

**B1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*прынтар, драйляны, эканомны, шэрапясчаны, інжэнер.*

**B2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*святкаваць, вясковы, бязлюдны, землемерны, секунда.*

**B3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*абхоччык, адрошчваць, вокладка, паказчык, абласны.*

**B4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*кассір, заціша, рассакрэціць, адкрыццё, ажыннік.*

**B5.** З прапанаваных лічэбнікаў вызначце той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*дваццаць, дзевяноста, пяцьсот, дзясяцера, семдзясят.*

**B6.** З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

*будаваць **(па) новаму**, ісці след **(у) след**, узяў **(у) ахапку**, **(у) глыб** марскую, **(што) дзень** вышываць.*

**B7.** З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:

*Якіх толькі экспанатаў (не, ні) пабачылі мы ў краязнаўчым музеі!*

**B8.** З прапанаваных слоў (формаў слоў) вызначце і запішыце тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе:
*дапамагаю, шырыня, рыхтуюць, працуецца, пагутарылі.*

**B9.** Вызначце, якія канчаткі маюць прапанаваныя дзеясловы ў форме абвеснага ладу 1-й асобы множнага ліку цяперашняга часу, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Мазаць. | **1.** -ем. |
| **Б.** Узважваць. | **2.** -ём. |
| **В.** Весці. | **3.** -ым. |
| **Г.** Вазіць. | **4.** -ам. |
| | **5.** -ім. |

**B10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Дадому. | **1.** Абрэвіяцыя. |
| **Б.** Аптэчны. | **2.** Прыставачна-суфіксальны. |
| **В.** Ахова. | **3.** Суфіксальны. |
| **Г.** Спецкурс. | **4.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |
| | **5.** Асноваскладанне. |

**В11.** Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** ... з шапкай.<br>**Б.** ... з гарохам.<br>**В.** ... у спіну.<br>**Г.** ... над галавой. | **1.** Шалік<br>**2.** Боб<br>**3.** Аршын<br>**4.** Дах<br>**5.** Вецер |

## Тэкст да заданняў *В*12—*В*22

(1) *Сказ — гэта цэласная граматычна і інтанацыйна аформленая адзінка моўных зносін, якая складаецца з аднаго або некалькіх слоў і служыць для выражэння думкі ці пачуцця.*

(2) *Паводле структуры (будовы) сказы падзяляюцца на простыя і складаныя.* (3) *Простыя сказы маюць адну граматычную аснову — дзейнік і выказнік.* (4) ***Яны** могуць мець толькі дзейнік **ці** толькі выказнік.* (5) *Граматычная аснова простага сказа паясняецца даданымі членамі ці ўжываецца без іх.* (6) *Просты сказ, які мае дзейнік і выказнік (састаў дзейніка і састаў выказніка), называецца двухсастаўным: Я спрабую **захаваць** у памяці кожную цікавую сустрэчу.* (7) ***Тыя** сказы, што маюць толькі адзін галоўны член сказа, называюцца аднасастаўнымі.* (8) *Напрыклад: Чароўныя палескія краявіды. На дабрыню адказваюць дабрынёй.*

(9) *Простыя сказы могуць быць неразвітыя і развітыя.* (10) *Неразвіты сказ складаецца толькі з галоўных членаў ці з аднаго з іх: Перамагла **маладосць**. Раніца.* (11) *Развіты сказ уключае ў сябе галоўныя члены сказа разам з даданымі: Рос ля хаты лесніка **роўны** клён.*

(12) *Сказ, у якім ёсць усе члены сказа, неабходныя для поўнага разумення сэнсу выказвання, называецца поўным.* (13) *Возьмем прыклад: Бяжыць уздоўж жытнёвага поля дарога майго юнацтва.* (14) *У няпоўным сказе прапушчаны той ці іншы даданы або галоўны член сказа.* (15) *Напрыклад: Пасля лесу — (бязмежная, безгранічная) ніва.* (16) *Можа быць прапушчана некалькі членаў сказа.* (17) *Прапушчаныя члены сказа ўзнаўляюцца з кантэксту ці сітуацыі маўлення.*

**В12.** Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:
1) тэкст афіцыйнага стылю;
2) тэкст публіцыстычнага стылю;
3) тэкст мастацкага стылю;
4) тэкст навуковага стылю;
5) тэкст гутарковага стылю.

**В13.** З двух слоў, выдзеленых у ***4-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі ***3-га*** і ***4-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***4-м*** сказе.

**В14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***15-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***15-м*** сказе.

**В15.** Знайдзіце ў ***8-м*** сказе тэксту слова, у якім ***3*** мяккія зычныя гукі. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***8-м*** сказе.

**В16.** Запішыце выдзелены ў ***10-м*** сказе тэксту назоўнік у форме творнага склону адзіночнага ліку.

**В17.** Запішыце выдзелены ў ***11-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.

**В18.** Запішыце выдзелены ў ***7-м*** сказе тэксту займеннік у форме роднага склону множнага ліку.

**В19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***6-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**В20.** Вызначце ў ***13-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

**В21.** Вызначце ў ***13-м*** сказе тэксту слова, якое мае нулявы канчатак. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***13-м*** сказе.

**В22.** Вызначце ў ***14-м*** сказе тэксту слова, якое з'яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***14-м*** сказе.

# Адказы

| Заданне | Варыянт | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **Частка *А*** | | | | | |
| *А*1 | 1, 2, 3 | 1, 2, 5 | 3, 4, 5 | 1, 3, 4 | 2, 4, 5 |
| *А*2 | 1, 4, 5 | 1, 2, 4 | 2, 3, 5 | 1, 3, 5 | 2, 3, 4 |
| *А*3 | 2, 3, 4 | 2, 4, 5 | 1, 3, 5 | 2, 3, 5 | 1, 2, 3 |
| *А*4 | 1, 2 | 4, 5 | 1, 5 | 3, 5 | 1, 3 |
| *А*5 | 1, 3, 5 | 1, 3, 4 | 1, 2, 3 | 1, 2, 5 | 3, 4, 5 |
| *А*6 | 3, 5 | 1, 5 | 2, 4 | 3, 4 | 2, 3 |
| *А*7 | 1, 5 | 2, 4 | 1, 3 | 2, 3 | 2, 5 |
| *А*8 | 3, 4, 5 | 1, 2, 3 | 1, 4, 5 | 2, 4, 5 | 1, 2, 4 |
| *А*9 | 1, 3, 4 | 3, 4, 5 | 1, 2, 5 | 1, 2, 4 | 1, 3, 5 |
| *А*10 | 1, 2, 5 | 2, 3, 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 | 1, 4, 5 |
| *А*11 | 1, 3 | 3, 5 | 3, 4 | 4, 5 | 1, 2 |
| *А*12 | 2, 3, 5 | 1, 4, 5 | 2, 3, 4 | 1, 2, 3 | 1, 3, 4 |
| *А*13 | 2, 4, 5 | 2, 3, 4 | 1, 2, 4 | 1, 4, 5 | 2, 3, 5 |
| *А*14 | 3, 4 | 2, 3 | 4, 5 | 2, 5 | 1, 4 |
| *А*15 | 1, 4 | 2, 5 | 2, 3 | 1, 5 | 3, 4 |
| *А*16 | 2, 3 | 1, 2 | 1, 4 | 2, 4 | 4, 5 |
| *А*17 | 1, 2, 4 | 1, 3, 5 | 2, 4, 5 | 3, 4, 5 | 1, 2, 5 |
| *А*18 | 2, 4 | 3, 4 | 1, 2 | 1, 4 | 1, 5 |
| **Частка *В*** | | | | | |
| *В*1 | канцылярыя | рысора | почырк | брызент | інжынер |
| *В*2 | вуглякіслы | жыццялюбства | ранняспелы | краязнаўства | землямерны |
| *В*3 | верталётчык | укладчык | газетчык | пераплётчык | абходчык |
| *В*4 | камісія | калекцыя | алегорыя | калектыў | касір |
| *В*5 | шэсцьдзясят | семдзесят | восемдзесят | пяцьдзясят | семдзесят |
| *В*6 | штовечар | штотыдзень | штораніцы | штогод | штодзень |
| *В*7 | не | ні | ні | не | не |
| *В*8 | дыхаецца | уздыхаецца | ікаецца | думаецца | працуецца |
| *В*9 | А1Б5В3Г2 | А3Б5В4Г1 | А5Б2В1Г3 | А2Б3В5Г1 | А4Б1В2Г5 |
| *В*10 | А4Б3В5Г1 | А5Б4В1Г3 | А3Б4В5Г2 | А1Б2В4Г5 | А2Б3В4Г1 |
| *В*11 | А5Б4В1Г3 | А1Б3В2Г5 | А2Б1В3Г4 | А4Б5В2Г3 | А3Б2В5Г4 |
| *В*12 | 4 | 3 | 5 | 2 | 4 |
| *В*13 | яна | імі | іх | яе | яны |
| *В*14 | незвычайных | паслізнешся | улоўным | пазнавальным | бязмежная |
| *В*15 | беларускія | нізкія | каралеўскія | блізкія | палескія |
| *В*16 | прыгажосцю | бязгучнасцю | духмянасцю | магчымасцю | маладосцю |
| *В*17 | асноўныя | бясконцыя | розныя | родныя | роўныя |
| *В*18 | тыя | тым | тых | тымі | тых |
| *В*19 | атрыманы | абагнаны | назбіраны | названы | захаваны |
| *В*20 | пасярод | сярод | пасля | дзякуючы | уздоўж |
| *В*21 | прыпынак | восень | світанак | шлях | прыклад |
| *В*22 | пракладзены | звязана | настоена | выдадзена | прапушчаны |